**Жыццёвыя крокі да ісціны – светлыя крокі да праўды і святасці (літаратурная работа ў рамках конкурса “Свет Праваслаўя”)**

**Крок 1.** Нам падаравана жыццё Богам, каб убачыць і адчуць свет праўды Хрыстовай.

Загарэлася зорка ў небе – новая душа зышла на замлю

Мы не памятаем, як прыходзім на гэту зямлю, але ў душы назаўсёды застаецца адбітак незвычайнасці і радасці, адчуванне адкрыцця бясконцай зямной прыгажосці. І цяпло, ласкавая інтанацыя бацькоў, тых, хто прынялі нас ад Бога, як вялікі дар. Яны, мамачка і татачка, трымалі нас у руках, маленькіх, зусім кволенькіх, і прасілі ў Бога абараніць ад усякага зла і нягод. Так, сапраўды, на зямлі, як выявілася, шмат яшчэ гора і зла, але ж, мы, толькі-толькі з’явіўшыся на свет, ужо адчувалі, што тут і цяпла, дабра шмат, што тут сонейка свеціць прыветна, птушкі спяваюць суладны гімн пастаяннаму абнаўленню зямной прыгажосці, а ім падпяваюць звонкія ручайкі і ціхі шум лісцікаў маладых бяроз. І мы, схаваўшыся на ласкавых бацькоўскіх руках, жылі ўжо поўным жыццём. Крыху пазней з’явіліся словы – першыя, і не было ў іх нават маленькай часткі намёку на хцівасць, жорсткасць, няпраўду. Дзіця, як чысты, нікім не засмечаны ліст, на ім Ісус Хрыстос піша свае неўміручыя ісціны, хрысціянскія запаветы – шануй маці сваю і бацьку свайго, не крадзі, не падманвай, не забі… Маленькі парастак дзіцячы з такой шчырай усмешкай глядзіць на свет і нават не можа ўяўляць сабе, што гэта такое – падман, непавага, нянавісць. Ён гатовы адразу выконваць усе запаведзі хрысціянства, для маленькага дзіцяці лік Хрыстовы – гэта гатовы план для ўспрыняцця жыццёвых радасцей і прыгажосці.

Я не памятаю сваіх першых хвілін на зямлі, але ў мяне засталося адчуванне вялікага непаўторнага свята – радасць спаткання з зямной прыгажосцю, якую падараваў мне Бог. Пах прывялай травы каля плоту, што нядаўна пакасіў мой тата, адчуванне на вуснах вільгаці ранішняй расы, ласкавы шэпт маёй роднай матулі, і слёзы не ад гора, а ад радасці, што я з’явілася, адчуваючы божую ласку, у такі прыгожы свет.

**Крок 2.** Усведамленне шчасця жыцця на зямлі.

Такі шырокі і вялікі свет –
Так хочацца хутчэй пазнаць яго таямніцы

А паспрабуй дакладна сказаць, калі прыйшло да цябе ўсведамленне, што ты ёсць важная часцінка свету, сваёй сям’і, і што свет гэты складаецца яшчэ са сваякоў, суседзяў, аднавяскоўцаў. І памятаецца чамусьці адразу яшчэ і дзіцячы эгаізм – мяне павінны ўсе любіць, я ж самая прыгожая, самая лепшая, самая разумная. Пра мяне так казалі матуля, тата, бабуля. Але разам з тым, з самага ранняга дзяцінства я пачала заўважаць не толькі добрае ў свеце. Аднойчы я пачула, як сусед крычаў на свайго сына, які не так як трэба зладжыў дровы ў паленніцу, пры гэтым лаяўся незразумелымі для мяне, але як я пазней зразумела, брыдкімі словамі. Крыху пазней на вуліцы мне пачалі сустракацца дзеці, якія былі злымі, незадаволенымі нечым, часам плакалі, стараліся адабраць ад мяне новую, нядаўна купленую ляльку. Мама мне растлумачыла, што гэта дзеці кепскіх бацькоў, якія не хочуць працаваць, не даглядаюць як

трэба сваіх дзяцей. Будучы яшчэ маленькім дзіцем, я пачала пакрысе думаць аб тым, што на свеце не ўсё заўсёды добра, што ёсць таксама і зло, чалавечыя заганы, якія мяшаюць жыць не толькі сабе, але і акружаючым. Бясконцыя пытанні я старалася задаваць сваім бацькам: “Чаму так часта плача суседская дзяўчынка? Чаму ў Святланкі няма мамы, а гадуе яе вельмі злосная бабуля? Ці можна мне падарыць ляльку Лене, ёй няма каму купіць такую прыгажуню?” Бацькі вучылі мяне па-добраму адносіцца да акружаючых людзей. Іх радавала, што я не шкадую сваёй лялькі, што мяне кранае гора іншых. А матуля аднойчы завяла мяне ў вясковую царкву – гэта значна пазней я даведалася, што названа яна ў гонар Святой Праведнай Ганны – а тады мяне ўпершыню ўразілі спакой і ціша, якія панавалі ў царкве, суровы, але добры твар Ісуса Хрыста, спагадлівыя лікі ікон Божай Маці з немаўляткам на руках. Мне, маленькай дзяўчынцы, здавалася, што іконы, выявы святых размаўляюць са мной, звяртаюць увагу, што па жыцці трэба ісці з дабром і змагацца за дабро. Пазней бабуля расказала мне пра пакуты Ісуса Хрыста, які не пашкадаваў свайго жыцця, каб выратаваць людзей. Я часта стала бываць у царкве, трымала свечку ў руках і старалася ўважліва ўслухоўвацца ў малітвы, ў песні царкоўнага хору, мне хацелася глыбей зразумець іх сэнс, увабраць як мага больш у сваю душу значэнне кожнага слова.

Яшчэ з самых ранніх гадоў я вельмі добра запомніла словы бабулі, якая паўтарала мне іх вельмі часта: “Расці вялікая, мая унучачка, і заўсёды спяшайся на голас дабрыні, і гэты голас цябе не падмане… Свет вялікі, і ён не без добрых людзей”.

**Крок 3.** Прыклад бацькоўскай любові і ласкі. Разуменне пятай хрысціянскай запаведзі.

Пятай запаведдзю Бог гаворыць нам шанаваць сваіх бацькоў, за што абяцае шчаслівае і доўгае жыццё. Я стараюся паважаць бацькоў, люблю іх ад усёй душы. Так здарылася, што калі пайшла ў школу, захварэла. Прыйшлося доўгі час знаходзіцца ў бальніцы, потым дома. На ўсё жыццё запомню дабрату і адданасць бацькоў і настаўнікаў. З той пары я зразумела, што сапраўды на зямлі больш людзей добрых, у якіх у душы жыве Бог, якія за сваю дабрату не патрабуюць адплаты, а дораць цяпло сваёй душы людзям таму, што зразумелі вялікую ісціну жыцця – дапамагчы тым, каму цяжка, і не шкадаваць часцінкі свайго сэрца іншым. У гэтым вялікая праўда Ісуса Хрыста.

У школе, на занятках факультатыва “Асновы праваслаўнай культуры”, вучэбных занятках я зразумела, у чым каштоўнасць сям’і, як астраўка вялікага шчасця для кожнага чалавека. Сям’я заўсёды была і ёсць асновай грамадства і царквы. Вельмі часта звяртаюся да свяшчэннай кнігі “Бібліі”, дзе сярод мудрых выслоўяў чытаю словы святых апостлаў: “Дзеці, будзьце паслушнымі сваім бацькам ва ўсім, таму што гэта патрэбна Госпаду…”

Я часта разважаю над тым, што любая справа, зробленая на карысць людзей, Радзімы, прыносіць шчасце не толькі акружаючым, але і сабе. Прыемна пасадзіць прыгожы кветнік, каб вакол было больш прыгажосці. Прыемна і патрэбна наведваць пажылых адзінокіх людзей для таго, каб дапамагчы ім і проста пагаварыць. Успомніць разам з імі, пра ваенныя гады,

што адабралі ў іх дзяцінства і бацькоў, і яны сталелі хутка, на па днях, а па гадзінах. Іх вочы бачылі і фіксавалі, як фотакамеры, злую, пачварную рэчаіснасць. Калі замест цацак часцей бачылі узброеных салдат, а чалавечы жах станавіўся нормай жыцця.

Я заўсёды буду памятаць словы адной з жанчын, ветэрана працы, што жыве на маёй вуліцы. Прыгожая ў сваім узросце, шчырая ў працы, яна сказала мне аднойчы: "Я вельмі задаволеная тым, як склалася маё жыццё. Я духоўна багаты чалавек. А матэрыяльнага багацця мне не трэба. Я маю што абуць і апрануць, у мяне выраслі цудоўныя дзеці, яны любяць мяне і паважаюць. У чым шчасце чалавека? Быць у дружбе з Богам. Тады душа твая будзе чыстая, з імкненнем да праўды і дабрыні."

Я шчаслівая, бо ў мяне ёсць бацькі, настаўнікі, што навучылі берагчы сваю душу, навучылі імкненню не згубіць самага галоўнага ў жыцці – духоўнай сувязі з роднымі і блізкімі людзьмі.

**Крок 4.** Душа як свечка ў храме. Ідэі Ісуса Хрыста знаходзяць водгук у мастацкіх творах

Хацеў бы патушыць
агонь у душы, а немагчыма.
Хацеў бы маўчаць, а
словы ліюцца самі па сабе на
чысты ліст, як на неўзараную раллю…

Свечка ў храме не тухне, язычкі полымя трымцяць то памалу, то хутка, нібы імкнучыся расказаць людзям, хай сабе без слоў, пра лёсы людскія, пра тое, чым цешыцца душа жывога чалавека. Дакранецца да незгасальнага полымя – і цяплей адразу стане, уваскрэснуць у памяці дарагія постаці, дарагія словы. Мудрасці людской, духоўнасція вучаць нас словы твораў мастацкай літаратуры. У іх прысутнічаюць думкі Хрыстовы. Яны ў кожным слове.

Колькі сябе памятаю, з самага ранняга дзяцінства мяне захаплялі вершы і паэмы, апавяданні і аповесці Якуба Коласа – аднаго з самых маіх любімых творцаў мудрага, неўміручага слова. У лузе, у полі я сустракалася з узнёслым Сымонам Музыкам, з любімцам дзяцей дзядзькам Антосем, з гаманлівымі, чулымі, мудрымі героямі з "Казак жыцця". А блукаючы па лесе, углядалася ў дрэвы, слухала спеў птушак, потым лясной сцяжынкай вярталася дахаты і з радаснай стомай садзілася за стол абедаць простай сялянскай стравай, як той ляснік Міхал, які вельмі спраўна нёс панскую службу на пасадзе лесніка.

Наш мудры дзядзька Якуб змог адкрыць вочы кожнаму беларусу на прыгажосць крынічкі, што спявае сваю адвечную песню, імкнучыся далёка, аж за вёску, пакідаючы за сабою гаючы след свежасці; змог расказаць аб тым, што пачулася яму ў магутным шуме дубовага лісця і ў асцярожным шэпце вярбы над шумлівай ракой.

Часам здаецца, што дзяцінства маё прайшло разам з сялянскім хлапчуком Кастусём: разам з ім мы пасвілі каровы на палянках у хвойніку, бегалі ў школу паўз бераг Нёмана, а вечарам шапталіся, седзячы на печы, на цёплым чаране, абмяркоўвалі новую прачытаную кнігу, або прыгоду, якая

адбылася з намі днём. І на душы заўсёды было так цёпла, прыемна. Часам праз сон чуваць быў ласкавы голас маці, якая, нешта робячы ў хаце, задушэўным голасам спявала народную песню…

Так здарылася, што лёс падараваў маленькаму хлапчуку Кастусю ўменне бачыць, адчуваць тое, што можа другім не пад сілу, а яшчэ ўменне растлумачыць усім людзям, што азначае любоў да сваёй Радзімы, да Бацькаўшчыны. Тут, непадалёку ад Нёмана, сочачы за сполахамі начных зарніц, ён пазнаваў мудрасць жыцця, выношваў у сабе думкі, якія потым прасіліся на паперу, як просіць засмяглымі вуснамі вады ў спякоту змучаны падарожнік.

На маім пісьмовым стале ў простай рамцы заўсёды стаіць партрэт Якуба Коласа. Мне прыемна гутарыць з ім уголас і пра сябе, у думках. Высокі лоб, вялікія пранікнёныя вочы, у якіх затаілася мудрасць, пяшчота сталага чалавека да ўсіх людзей, можа, нават, сум ад таго, што прыйшлося пакінуць гэты свет, развітацца з тым, што так моцна любіў, да чаго прыкіпеў душой. Расказаць яму хочацца аб сваіх марах, аб поспехах, а можа і параіцца. Я веру ў вялікую магутную энергічную сілу слова паэта і яго думак. У кожным слове імкненне перадаць чытачу цікавасць да навакольнага свету, да прыроды, разуменне таго, што такая цікавасць абуджае прагу да набыцця новых ведаў, да пазнання законаў жыцця.

А калі смутак пасяляецца ў душы, я заўсёды звяртаюся да вершаў Якуба Коласа аб прыродзе. Там мяне сустракае такая прачуласць, замілаванасць роднымі краявідамі. Памятаю, як першы раз прыйшлося чытаць самой сабе ў пустым пакоі верш “Ручэй”. І час тады для мяне перастаў існаваць, рэчы знікалі, а быў чуваць толькі звонкі голас ручайка, адчуваўся пах кветак, траў і яшчэ чагосьці невядомага, раней нечуванага. Для мяне адкрыўся зусім новы свет, які, як той агеньчык царкоўнай свечкі, палае, трымціць, пасяляючы ў чалавечай душы веру ў цудоўнае і лепшае. Пра што гэты верш расказаць немагчыма, такі шэдэўр можна толькі адчуваць, а яшчэ захаваць у сваёй душы як чыстую радасць ад таго, што свет, аказваецца, такі прыгожы, незвычайны і непаўторны, як вобразы на карцінах вялікіх мастакоў.

Душа жывая назіраецца ва ўсіх творах Якуба Коласа. Яна размаўляе з чытачом адкрыта, шчыра і вядзе за сабой па дарогах , адкрываючы новае, раней нязведанае. “Паслухай, дачушка, як хораша гучаць словы”, кажа мне мама і павольна пачынае чытаць:

Між палёў шырокіх
Я адзін стаю,
Ахвапіла ціша
Усю душу маю.
Ночанька мая ты,
Водблеск глыбіні!
Ты душу чаруеш
Спевам цішыні,
Многа ў гэтым спеве
Водгукаў жывых,

Іх не зловіш вухам,
Чуеш сэрцам іх. ( “Ноч”)

У пакоі і на вуліцы цішыня. Маўчым і мы з сваёй матуляй. Не хочацца парушыць ні словам, ні лішнім рухам незвычайны спакой і пачуццё таго, што душа напоўнена бязмежнай радасцю, не трэба яе праганяць, няхай яна паселіцца у нашай душы назаўсёды. Як цудоўна жыць з такім пачуццём…

А над Нёманам у Мікалаеўшчыне шумна круглы год. Ідуць і ідуць сюды людзі, на сядзібу да Якуба Коласа, да Міхала і Антося, да мудрай, пяшчотнай матулі маленькага Кастуська, да старога дуба, ствол якога некалі гладзіў паэт, што заўсёды імкнуўся на сваю родную зямлю з далёкіх краёў. Тут кожная травінка памятае крокі паэта, а камень страціў холад, ён сагрэты рукой Якуба Коласа. Тут, каля гэтата каменя, так яскрава, моцна, прачула гучаць словы, дзе закладзена і прызнанне ў любві да сваёй Радзімы, і імкненне навучыць чытачоў бачыць прыгожае, непаўторнае не недзе далёка, а тут, на сваім родным лузе, поўным пахучых кветак, у лесе, дзе пошум стогадовых дубоў згадвае нам пра магутнасць і сілу нашай зямлі.

**Крок, які яшчэ не ступіла.** Гэты крок – дарога ў будучыню, дзе мне наканавана пакінуць свой след на зямлі. Ведаю ўжо добра, што няпроста жыць на зямлі па законах хрысціянскіх запаведзей. Але імкнуцца да гэтай святыні буду заўсёды, і тады, калі ступлю першы крок на самастойную жыццёвую сцяжынку. Ісціны запаведзей – Хрыстовы ісціны, яны вечныя на нашай зямлі. Гэтыя словы як законы жыцця чалавечага, што прызываюць любіць Бога, сваю родную зямлю, спадчыну. А спадчына – гэта і абразы з выявай Хрыста ў бацькавай хаце, і сад, пасаджаны бацькам вакол хаты, і ручнікі, што вышывала маці. Пастараюся жыць так, каб не страціць самага галоўнага ў жыцці – духоўнай сувязі з родным народам, з роднымі людзьмі.